# З нагоды сустрэчы з краязнаўцам, пісьменнікам, літаратуразнаўцам Міхасём Казлоўскім

Пра многія важныя рэчы казаў наш знакаміты зямляк, але мне падаўся асабліва цікавым яго аповед  пра нараджэнне кнігі. Міхась Міхасевіч  яскрава апісаў свае творчыя мукі, як цяжка даецца пісьменства. Ён правёў шмат аналогій паміж творчасцю розных знакамітых людзей, якія сумесна з ім стваралі новую кнігу ***“Язэп Драздовіч. Праз церні да зорак”***

Ад выдатнага маўлення пісьменніка на роднай мове стала сорамна за маю беларускую мову. Але так захацелася адчуць пах новай кнігі, зацікавіцца  новай гісторыяй, стварыць нешта больш значнае, чым рабіў раней. На мой погляд, гэта самае каштоўнае, што можна ўзяць ад Сустрэчы з такім  чалавекам – падхапіць мо натхнёнасць, адчуць мо настрой, жадаць стаць лепшым, чым ты ёсць…

З павагай Т.У.Свістуленка

Вельмі цікавай была сустрэча з Міхасём Казлоўскім. Асабліва, як ён расказваў  пра сваё жыццё і пршы вопыт напісання кнігі. Мне запомнілася, што кнігу пісаць вельмі няпроста. Каб прыйшло натхненне, трэба нават  паехаць у другое месца, змяніць абстанўку і акружэнне… Цікава расказваў пісьменнік пра Язэпа Драздовіча.

Вадзім Вайцяховіч

Мне спадабалася сустрэча з Міхасём Казлоўскім, спадабаўся расказ пра Язэпа Драздовіча і пра ўласнае жыццё і творчасць. Такія сустрэчы вельмі патрэбныя, бо мы павінны ведаць гісторыю сваю і свайго краю.

Улад Шастаковіч

Дваццаць трэцяга сакавіка ў чытальнай зале бібліятэкі нашага каледжа адбылася сустрэча з пісьменнікам Міхасём Казлоўскім. Ён прадставіў многа цікавых фактаў з жыцця  нашага знакамітага земляка Язэпа Драздовіча. Цікава, што ён сніў сны і потым іх занатоўваў у сваіх малюнках Ён, Язэп Драздовіч, быў вельмі  таленавітым чалавекам. Міхась Казлоўскі расказаў, як узнікла ідэя напісаць кнігу  ***“Язэп Драздовіч. Праз церні да зорак”***

Міхась Казлоўскі вельмі зацікавіў мяне і маіх аднагрупнікаў тым, што калі працуе. То не карыстаецца кампутарам, а піша  на паперы, каб адчуць паперу ў сябе пад рукой – гэта надае натхненне і  дапамагае ў творчасці.  А ў кнізе пра  Язэпа Драздовіча ён змясціў звесткі , якія сталі вынікам яго мнагалетняй працы ў архівах, у паездках у Вільню…

Валянцін Барбышаў

Міхась Казлоўскі расказаў нам пра Язэпа Драздовіча. Ён быў пісьменнікам, паэтам, мастаком, вельмі таленавітым, але, на жаль, не знакамітым. Кніга, якую напісаў Міхась Казлоўскі не толькі вельмі прывабная знешне, але і змястоўная. Пісьменнік расказаў нам, якія раздзелы яна мае і надпісаў нам пажаданне ў ёй, каб мы не забываліся на свае карані, любілі Беларусь і берaглі ўсё тое, што пакінута нам у спадчыну. Кніга ёсць ў нашай бібліятэцы, і кожны можа прыйсці і пацікавіцца ёй.

У нашай Беларусі многа таленавітых людзей, але мы вельмі мала пра іх знаем. Міхась Міхасевіч распавёў нам пра беларускага пісьменніка Арсеня Ліса, таксама вельмі таленавітага, але нам зусім невядомага. Арсень Ліс патэлефанаваў М.Казлоўскаму і папрасіў таго напісаць уступны артыкул да свайго юбілейнага выдання. Пісьменнік згадзіўся, і калі напісаны артыкул ён адвёз Арсеню Лісу, той, прачытаўшы, заплакаў, бо да гэтага ніхто ніколі пра яго не пісаў. Сустрэча з Міхасём Казлоўскім была вельмі цікавая.

Павел Аліноўскі

Дзякуй міхасю Казлоўскаму, што ён знайшоў для нас час і расказаў нам пра тое што мы павінны ведаць: пра нашу гісторыю, пра пісьменнікаў, пра творчасць наогул, а асабліва за тое, што ён расказаў нам пра Язэпа Драздовіча, які нягледзячы на сваю беднасць і нястачу усё роўна пісаў кнігі, вершы, нават малявау карціны разведзенай у вадзе сажай, бо грошай на фарбы ў яго не было. Я згодны з пісьменнікам, што кожны чалавек можа стаць творцам, калі ў яго да гэтага будзе жаданне.

Максім Матук

Пра Язэпа Драздовіча я чуў упершыню, але пасля расказа Міхася Казлоўскага захацелася пазнаёміцца з жыццём і творчасцю гэтага чалавека. Вельмі прывабіла кніга ***“Язэп Драздовіч. Праз церні да зорак”*** Думаю, што не толькі я захацеў яе пачытаць.

Мікалай Сурынт

Міхась Казлоўскі расказаў пра Язэпа Драздовіча. Ён быў бедны, не меў свайго жылля, здымаў вуглы і пакоі ў сяброў і знаёмых, але пісаў карціны. Яму не заўсёды даставала грошай на краскі, таму пісаў ён вуглём альбо разведзенай вадой сажай, таму асноўныя колеры яго карцін чорны і белы.

Уладзімір Талеронак

Мне асабліва спадабалася гісторыя кахання Язэпа Драздовіча. Ён ніколі не быў жанаты, хоць і быў высокі, прыгожы, з барадой… Аднойчы ён закахаўся ў дзяўчыну, разумную, адукаваную і таксама вельмі прыгожую. Але яна яму сказала “НЕ”. Ён некалькі разоў прапаноўваў ёй руку і сэрца, але адказ быў “НЕ”. А потым, калі Язэп Драздовіч працаваў настаўнікам ў школе, ён закахаўся у маладую дваццацігадовую вучаніцу.Яму было сорак год, але ці важны ўзрост, калі ёсць каханне?.. Але сказала “НЕ” маці дзяўчыны. Больш кахання ў яго не было, і пражыў ён адзінокім… Яму сніўся космас, людзі ў скафандрах.

Часта сярод ночы ён уставаў і запісваў ці замалёўваў свае сны. Ён мог бы стаць “Цыалкоўскім”!

Андрэй Філон

Кніга “Язэп Драздовіч. Праз церні да зорак” вельмі аб’ёмная і цікавая. Стоіла б калі не прачытаць, дык уважліва пагартаць старонкі, каб дакрануцца да высокага мастацтва. Сустрэча прайшла вельмі хутка, але мне вельмі спадабалася слухаць пісьменніка.

Валерый Палонскі

С 23 марта в нашем проходила Неделя филологических дисциплин, и нас пригласили на встречу с писателем, литературоведом, краеведом Михасём Козловским, который представил нам свою новую книгу ***«Язэп Драздовіч. Праз церні да зорак»*** (кстати, в читальном зале нашей библиотеки есть книга Михася Козловского “Да кніжных скарбаў дакрануся”, которую он же презентовал нашим учащимся ранее).

Посмотрев в глаза этому удивительному человеку – а глаза у него бездонные и очень добрые – я подумал, что в них с рождения заложен какой-то “секрет”, и раскрылся этот “секркт” с возрастом, превратившись в дар писательства.Мы все очень внимательно слушали этого удивительного человека, и атмосфера в зале была очень тёплая и дружелюбная. На пам'ять о встрече были сделаны фотографии.

Дмитрий Пискун

Послушав М.М.Козловского, я понял, что и в нашем городе есть замечательные люди. Мы очень внимательно слушали Михася Козловского, а он рассказывал так много интересного из истории края, из жизни замечательных людей нашего края, что не вопросы задавать хотелось, побольше узнать из истории нашей земли.

Никита Захаревский

Встреча мне очень понравилась, так как увидели книгу и узнали о том, как она создавалась, узнали про Язэпа Дроздовича, узнали многое из жизни самого Михася Козловского и его товарищей-писателей,а ещё услышали призыв, который нельзя не услышать: мы не должны только брать у Беларуси, а должны уметь отдавать ей силы, старание, должны любить свою страну и “жить для Беларуси”.

Павел Юхновец

Сустрэча з цікавым чалавекам дапамагла мне зразумець, што ў жыцці ёсць многа абавязкаў, якія мы, маладыя, павінны выконваць: паважаць і шанаваць традыцыі, ганарыцца сваёй краінай, зямлёй нашых продкаў, быць патрыётамі сваёй Радзімы.

Дзмітрый Далецкі